Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ХІ-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII год выданьня штодзённая газэта

ПЯТНІЦА 18 ЛІСТАПАДА 1932 г.
№ 254 (3623)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сэкцыяў . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званка)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца і выключа на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радо 1 нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары:

ПЕРАДАВЫ: Сустрэць паход хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

БУЛЬБА—ЛЕНІНГРАДУ: Тэмпы адгрузкі нарастаюць нездавальняюча, Прырост за дзень толькі 1,7 проц. Неадкладна пакрыць запазычанасьць пралетарам Ленінграду. (1-ая стар.).

20-га пачынаем «Усебеларускі паход саветаў за шырспажыў. Саветы, дэпутаты і сэкцыянэры! Усе сілы ўсю энэргію накіраваць на пасьпяховае правядзеньне паходу за рэалізацыю рашэньняў верасьнёўскага пленуму ЦК. (1-ая стар.).

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ: Зламаць кулацкі сабатаж, цалкам спагнаць цьвёрдыя заданьні ў найкарацейшы тэрмін. (4-ая стр.)

Справа гонару кожнага раёну быць у першых радох ў барацьбе за фінплян 4-га кварталу (4-ая стар).

ЗА ГРАНІЦАЙ (4-ая стар.).

Сустрэць паход хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Сёньня мы публікуем пастанову прэзыдыуму ЦВК БССР аб правядзеньні ўсебеларускага двухмесячніку паходу саветаў і іх масавых зьвязкоў—дэпутацкіх груп і сэкцый дэпутатаў і сэкцыянэраў за рэалізацыю рашэньняў верасеньскага пленуму ЦК Усе КП(б) у галіне вырабу тавараў шырокага спажываньня.

Гэтая пастанова мае выключна важнае палітычна-гаспадарчае значэньне ня толькі ў сэнсе выкананьня актуальнейшых задач, якія стаяць на даным этапе перад краінай Саветаў у галіне ўсямернага палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў працоўных як гораду, так і вёскі, але і ў сэнсе забясьпечаньня максымальнай арганізацыі і мабілізацыі творчай актыўнасьці працоўных мас, уцягнутых у работу саветаў на канкрэтнае праламленьне ў жыцьцё гэтых задач.

У гераічнай барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва выключна важную і вялікую ролю адыгрываюць саветы—органы дыктатуры пралетарыяту, якія пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, арганізуючы працоўныя масы, маюць ня мала заслуг у справе выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Поўным выкананьнем усіх высунутых пастановай прэзыдыуму ЦВК мерапрыемстваў саветы зробяць яшчэ адзін вялікі крок наперад у справе ажыцьцяўленьня лёзунгу нашай партыі—«саветы—тварам да вытворчасьці і да калгаснага будаўніцтва».

У непрымірымай барацьбе нашай партыі з усімі праявамі апартунізму дасягнуты гіганцкі рост індустрыі і сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі. На гэтай аснове стала магчымым больш шпаркае разгортваньне лёгкай і харчовай прамысловасьці і пашырэньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня.

Усямернае разгортваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня зьяўляецца магутным фактарам далейшага палепшаньня матар'яльна-бытавых умоў працоўных адыгрывае рашаючую ролю ў пасьпяховым разгортваньні савецкага гандлю і яго арганічнага зьвязку—калгаснага гандлю, ва ўсямерным прыцягненьні на гарадзкі рынак сельска-гаспадарчых прадуктаў.

АБВЕШЧАНЫ ПРЭЗЫДЫУМАМ ЦВК БССР УСЕБЕЛАРУСКІ 2-х МЕСЯЧНЫ ПАХОД САВЕТАЎ ЗА ШЫРСПОЖЫЎ ПАВІНЕН І МОЖА НА ПРАКТЫЦЫ ДАЦЬ РАШУЧЫ ЗРУХ У СПРАВЕ РЭАЛІЗАЦЫІ РАШЭНЬНЯ ВЕРАСЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УСЕКП(б), У СПРАВЕ ПАСЬПЯХОВАГА І СВАЯЧАСОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ ВЫРАБУ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬНЯ Ў АПОШНІМ КВАРТАЛЕ ЗАВЯРШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, У СПРАВЕ ЎСТУПЛЕНЬНЯ З НАЙЛЕПШЫМІ ПАКАЗЬНІКАМІ Ў ДРУГУЮ ПЯЦІГОДКУ.

Цэлым комплексам мерапрыемстваў партыя і ўрад забясьпечылі ўсе ўмовы для ўзмоцненага вырабу тавараў шырспажыву. Аднак пляны вырабу тавараў шырспажыву выконваюцца ўсё яшчэ нездавальняюча. У ліку іншых прычын, выклікаўшых невыкананьне рашэньня ЦК у разьмерах вырабу прадметаў шырспажыву зьяўляецца вельмі недастатковае выкарыстаньне мясцовых сыравінных рэсурсаў. У нас ёсьць вялізарнейшыя крыніцы нескарыстаных адыходаў. У іх хаваюцца сотні мільёнаў рублёў прадукцыі шырспажыву.

Максымальна разгарнуць актыўнасьць дэпутатаў і сэкцыянэраў па неадкладнай пераапрацоўцы гэтых адыходаў на прадпрыемствах лёгкай і харчовай прамысловасьці—такая баявая задача дня. Трэба забясьпечыць неадкладную пераапрацоўку сотняў он адыходаў, якія не скарыстоўваюцца прамысловасьцю. Неабходна накіраваць усю работу па правядзеньні двухмесячнага паходу ў такім напрамку, каб выклікаць да жыцьця максымальную колькасьць новых нескарыстаных рэсурсаў, каб арганізаваць дадатковы асартымэнт і забясьпечыць максымальную эфэктыўнасьць у рабоце.

Задача паходу заключаецца ў тым, каб пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый мабілізаваць шырокія масы выбаршчыкаў шляхам укараненьня сацыялістычных форм работы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва па крапатлівую і ўпартую барацьбу за справу адшуканьня дадатковых рэсурсаў, за справу штодзённага збору і максымальна эфэктыўнага скарыстаньня ўтылю, за справу ўжываньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, за забясьпечаньне таннасьці і якасьці выраблямых тавараў. Гэты паход павінен даць яшчэ больш рашучы зрух ва ўмацаваньні сацыялістычнай сувязі паміж прамысловасьцю і прамарцелямі, паміж горадам і вёскай.

Гарсаветы і РВК, мабілізаваўшы свой актыў на сапраўднае выкананьне заключаных сацыялістычных умоў паміж дэпутацкімі групамі прадпрыемстваў і дэпутацкімі групамі сельсаветаў і паасобных калгасаў, адны на арганізацыі вывазу лішкаў сельска-гаспадарчай прадукцыі на калгасны базар, а другія па арганізацыі сустрэчнага патоку прамтавараў для стымуляваньня калгаснага гандлю, па ўпарадкаваньні і культурным абслугоўваньні базараў, могуць на практыцы паказаць, якую вялізарнейшую ролю адыгрывае сапраўднае выкананьне рашэньня верасеньскага пленуму ЦК па вырабе шырспажыву, у справе далейшага ўздыму дабрабыту працоўных мас гораду і вёскі і ўмацаваньня змычкі паміж апошнімі.

«Задачай другой пяцігодкі зьяўляецца ўзьнікшае ня менш чым у 2-3 разы сучаснага ўзроўню забясьпечаньне насельніцтва асноўнымі прамысловымі і харчовымі таварамі. Такая грандыёзная задача на працягу аднаго пяцігодзьдзя не пад сілу ні толькі ніякай буржуазнай дзяржаве, яна не пад сілу была і нам у першай пяцігодцы. Толькі цяпер на аснове пераможнага ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі, на аснове таго, што мы ідзем да пераможнага завяршэньня першай пяцігодкі ў 1932 годзе,—толькі на гэтай аснове можна і трэба было паставіць пытаньне аб далейшым і прытым рашучым палепшаньні жыцьця працоўнага насельніцтва ў другой пяцігодцы». (Молатаў).

Прэзыдыум ЦВК зьвярнуў асаблівую ўвагу ўсіх саветаў і іх масавых зьвязкоў на надзвычайна вялікую палітычную важнасьць пасьпяховага правядзеньня гэтага паходу. «Наша задача складаецца з таго, каб мы ў барацьбе за шырспажыў разгарнулі ўжо творчую актыўнасьць мас і накіраваць яе ня толькі на вялікія справы, але і на так званыя «маленькія справы», якія набываюць вялікае значэньне» (Каганові). Кожны дэпутат, сэкцыянэр і актывіст саветаў павінен мець і выканаць пэўны абавязак, зьвязаны з двухмесячным паходам.

ПАКАЗАЦЬ ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ РАШЭНЬНЯЎ ЦК ПА ВЫРАБЕ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬНЯ—ВОСЬ «ГВОЗДЬ» ПАХОДУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТЫХ ЗАДАЧ САВЕТЫ І ІХ МАСАВЫЯ ЗЬВЕНЬНІ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПАВІННЫ ЗМАГАЦЦА З БАЛЬШАВІЦКАЙ ЭНЭРГІЯЙ І НАПОРЫСТАСЬЦЮ.

ПЕРАТВАРЫЦЬ УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД САВЕТАЎ У АДЗІН З МАГУТНЫХ ВАГАРОЎ ПЕРАМОЖНАГА ЎСТУПЛЕНЬНЯ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЦЭХАЎ, АРЦЕЛЯЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ ПА ВЫРАБЕ ШЫРСПАЖЫВУ, У ДРУГУЮ ПЯЦІГОДКУ.

Новай хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва дэпутатаў, сэкцыянэраў і ўсяго савецкага актыву сустрэнем і правядзем двухмесячны паход.

20-га пачынаем „Усебеларускі паход саветаў за шырспажыў“

Саветы, дэпутаты і сэкцыянэры! Усе сілы, усю энэргію накіраваць на пасьпяховае правядзеньне паходу за рэалізацыю рашэньняў верасьнёўскага пленуму ЦК

„Прапанаваць Наркамлёгпрому, Наркамяжпрому і самп. амкаапэрацыі дабіцца рашучага пералому ў адносінах да вырабу прадметаў шырспажыву як цэнтральных апаратаў, так і ўсіх вытворчых прадпрыемстваў, устанавіўшы пэрсанальную адказнасьць за выраб прадметаў шырспажыву ў кіраўніцтвах, трэстах і прадпрыемствах“

(З рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б)

„Падкрэсьліваючы вялікае палітычнае значэньне пашырэньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня для ўмацаваньня змычкі паміж горадам і вёскай,—пленум ЦК УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным, камсамольскім, прафсаюзным і савецкім арганізацыям аказваць усямерную садзейнасьць гаспадарчым арганізацыям і прамкаапэрацыі ў справе разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня“)

(З рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б)

Аб правядзеньні двухмесячніку паходу сэкцый і дэпутацкіх груп саветаў у галіне разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Усямернае разгортваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня, барацьба за выкананьне і перавыкананьне пляну гэтай вытворчасьці, выяўленьне ўнутраных рэсурсаў, рацыяналізацыя вытворчасьці, асваеньне новых відаў сыравіны і г. д. зьяўляецца асноўнай задачай саветаў і іх масавых органаў—сэкцый і дэпутацкіх груп у справе выкананьня пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб шырспажыве як аднаго з асноўных мерапрыемстваў па далейшым палепшэньні матар'яльна бытавых умоў працоўных і ўмацаваньня змычкі рабочае клясы з сялянствам.

Выходзячы з вышэйадзначанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Ухваліць ініцыятыву рэдакцыі газэты «Сав. Бел.» аб правядзеньні двухмесячніку паходу саветаў за выкананьне пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб шырспажыве.

2. Мэтай паходу павінна зьявіць па мабілізацыі актыўнасьці дэпутатаў, сэкцыянэраў, усяго савецкага актыву і ўсіх працоўных на справу арганізацыі новых утыльцэхаў, новых прадпрыемстваў, майстэрняў, арцеляй па вырабе прадметаў шырокага спажываньня, на арганізацыю дадатковага асартымэнту, забясьпечаньне таннасьці і лепшай якасьці тавараў, на справу забясьпечаньня ўсямернага стымуляваньня калгаснага гандлю, шляхам арганізацыі сустрэчнага патоку прамтавараў на калгасны рынак.

3. Прадстаўленую праграму паходу ЗАЦЬВЕРДЗІЦЬ.

4. Паход распачаць 20 лістапада г. г.

5. Для кіраўніцтва паходам арганізаваць пры Прэзыдыуме ЦВК БССР Цэнтральную Камісію пад старшынствам Сакратара ЦВК БССР тав. Гікялкевіча ў складзе: загадчыка Арганінструктарскага аддзелу Прэзыдыуму ЦВК тав. Хілманова, прадстаўнікоў: рэдакцыі «Савецкая Беларусь» тав. Адамсона, НК РСІ—Левіна, ЦСПСБ—Плешакова.

Даручыць Упаўпаркамяжпрому, Наркамлёгпрому і Самтрамсавету прыняць удзел у правядзеньні паходу.

6. Для забясьпечаньня канкрэтнага кіраўніцтва паходам саветаў, за выкананьне пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб шырспажыве на мясцох прапанаваць Гарсаветам і РВК арганізаваць раённыя і гарадзкія камісіі пад старшынствам старшыні РВК або гарсавету ў складзе: прадстаўніка РайРСІ, райпрафбюро і рэдакцыі раённай газэты.

7. Абавязаць РВК і гарсаветы забясьпечыць сыстэматычнае асьвятленьне ў друку паходу саветаў за выкананьне рашэньняў верасьнёўскага Пленуму ЦК УсеКП(б) аб шырспажыве.

8. Улічваючы, што лепшым мэтадам па мабілізацыі саветаў і іх масавых органаў—сэкцый і дэпутацкіх груп зьяўляецца сацыялістычны мэтад працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, абавязаць РВК і саветы разгарнуць канкрэтную работу па заключэньні саццагавароў паміж паасобнымі дэпутацкімі групамі, сэкцыямі, саветамі і райвыканкомамі на лепшую арганізацыю і правядзеньне двухмесячніку, забясьпечыўшы сыстэматычную праверку выкананьня саццагавароў.

9. Для арганізацыі праверкі паходу даручыць Цэнтральнай Камісіі арганізаваць радыё-перакліч РВК і саветаў аб практычным ажыцьцяўленьні праграмы паходу.

10. Для падвядзеньня вынікаў паходу склікаць Усебеларускі зьлёт удзельнікаў паходу дэпутацкіх груп і сэкцый у студзені 1933 г.

11. Абавязаць раённыя камісіі паходу праз кожныя 15 дзён падаваць Цэнтральнай камісіі зводкі аб ходзе выкананьня праграмы паходу.

12. Лічыць неабходным стварыць фонд прэміраваньня лепшых дэпутацкіх груп, сэкцый і актывістаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

ПАРАДАК І ПЛЯН

правядзеньня Ўсебеларускага двухмесячніка

Цэнтральная камісія, паставіўшы перад сабой задачу—канкрэтнае праламленьне ў жыцьцё пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР па пытаньні правядзеньня Ўсебеларускага двухмесячніка паходу саветаў, дэпутатаў і сэкцыянэраў за справу рэалізацыі рашэньняў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) у галіне вырабу тавараў шырокага спажываньня, намеціла для правядзеньня наступныя мерапрыемствы:

I. 20-23 лістапада

Па ўсёй Беларусі, ва ўсіх гарадох і раёнах на паасобных прэзыдыуму гарсаветаў і РВК спецыяльна абгавараецца пастанова Прэзыдыуму ЦВК і намячаюцца канкрэтныя шляхі яе рэалізацыі. Распрацоўваюцца і зацьвярджаюцца канкрэтныя пляны ў галіне забясьпечаньня штодзённага апэрацый на а кіраўніцтва і аказаньня практычнай дапамогі сэкцыям і дэпутацкім групам у справе правядзеньня работы па двухмесячніку.

Вылучаюцца раённыя і гарадзкія камісіі. Прымацоўваецца раённы актыў на ўвесь пэрыяд паходу да паасобных аб'ектаў—заводаў, фабрык, самтрамарцеляй, сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў і іншых аб'ектаў для дапамогі і канкрэтнага ўдзелу ў правядзеньні ўсёй гэтай работы.

II. 23-24 лістапада

Раённыя і гарадзкія камісіі праводзяць інструкцыйныя нарады саветаў і савецкага актыву як гораду, так і вёскі, дзе абгаворваюцца і распрацоўваюцца пытаньні правядзеньня практычных мерапрыемстваў па двухмесячніку.

III. 24-26 лістапада

1. На фабрыках, заводах, прамарцелях праводзяцца пашыраныя нарады дэпутацкіх груп з абгаварэньнем станоўчага і плянаў вырабу тавараў шырокага спажываньня, дзе намячаюцца канкрэтныя шляхі па выкананьні і перавыкананьні плянаў, забясьпечаньня якасных і колькасных паказьнікаў у адносінах кожнага прадпрыемства і самтрамарцелі паасобку.

2. Праводзяцца рабочыя сходы ў цэхах, брыгадах, дзе прыводзяцца вычарпальныя даныя аб магчымасьцях скарыстаньня ўтыль-адыходаў як на заводзе ў цэлым, так і на кожным вытворчым вучастку паасобку. Абіраюцца брыгады для выяўленьня незакранутага памяшканьня, абсталяваньня і г. д. Абвешчаецца конкурс рацыяналізатарскіх прапаноў, прыцягваюцца да ўдзелу ў гэтай рабоце ІТР, распрацоўваюцца тэмнікі, дзе ўказваюцца, якія ёсьць адыходы на заводзе і арганізоўваецца падача прапаноў—што з гэтых адыходаў лепш зрабіць. Арганізоўваюцца выстаўкі ўтылю і радам з утылем выстаўляецца гатовая прадукцыя.

3. Заключаюцца сацыялістычныя дагаворы паміж паасобнымі РВК, саветамі, сэкцыямі, дэпутацкімі групамі на лепшае выкананьне мерапрыемстваў па паходзе.

4. Забясьпечваецца заключэньне ўмоў, арганізацыя шэфства паміж дэпутацкімі групамі дзяржпрадпрыемстваў і арцелямі самтрамкаапэрацыі.

5. Высылаюцца прадстаўнікі сэкцый і дэпутацкіх груп гораду ў сельсаветы для арганізацыі сацыялістычнай сувязі паміж горадам і вёскай, для заключэньня сацыялістычных умоў па рэалізацыі рашэньняў пленуму ЦК з масавымі зьвяньнямі сельсаветаў—арганізацыі сустрэчы патоку прамтавараў на калгасны рынак, па ўпарадкаваньні культурнага абслугоўваньня калгаснага рынку, па арганізацыі начыначных і пашывачных майстэрняў, па арганізацыі вывазкі лішкаў сельска-гаспадарчай прадукцыі на калгасны рынак, на зборы ўтыльсыравіны і г. д.

IV. 1-10 сьнежня 10-20 студзеня

1. Ва ўсіх гарадох і мястэчках у парадку выкананьня сацыялістычных дагавораў паміж масавымі зьвеньнямі гораду і вёскі арганізоўваюцца калгасныя базары.

2. У гэты-жа адрэзак часу сіламі сэкцый і дэпутацкіх груп праводзіцца праверка падрыхтаванасьці гандлёва-снабжэнчаскіх і іншых арганізацый да сустрэчы калгаснага базару.

V. 10-20 сьнежня

У Менску сіламі дэпутацкіх груп і сэкцый праводзіцца праверка работы органаў Наркамлёгпрому, Наркамяжпрому, самтрамкаапэрацыі ў галіне забясьпечаньня з боку апошніх кіраўніцтва і дапамогі прадпрыемствам па вырабе тавараў шырокага спажываньня. Брыгады для правядзеньня гэтага мерапрыемства выступаюцца на сходах дэпутацкіх груп (23-24 лістапада).

VI. 20-24 сьнежня

Па гарадох—Гомель, Менск, Ворша, Барысаў, Віцебск, Бабруйск ставіцца спэцыяльна пытаньне аб становішчы арганізацыі начыначных і пашывачных майстэрняў. Стварацца спэцыяльныя брыгады сэкцыянэраў для нагляду за забясьпечаньнем памяшканьнямі, абсталяваньнем, кадрамі і інш.

VII. 25-28 сьнежня

Для падвядзеньня папярэдніх вынікаў правядзеньня паходу арганізоўваецца Ўсебеларуская радыё-перакліч дэпутацкіх груп.

VIII. 5-9 студзеня

У гарадох і раённых цэнтрах, дзе ёсьць фабрыкі і заводы, праводзіцца паход дэпутацкіх груп і сэкцыянэраў на заводзкія і фабрычныя двары для выяўленьня нескарыстаных адыходаў з утылю.

IX. 20-25 студзеня 1933 г

1. Для падвядзеньня вынікаў усёй праведзенай работы на мясцох, арганізоўваецца Ўсебеларуская масавая узаемная праверка. (Гарсавет праверае суседні гарсавет, РВК—РВК, сельсавет—сельсавет і г. д.).

2. Ва ўсіх раёнах і гарадох праводзіцца агульна-раённыя і агульна-гарадзкія зьлёты дэпутацкіх груп, дзе падводзіцца вынікі як праведзенай масавай праверкі, так і ўсёй праведзенай работы за пэрыяд паходу. Там-жа вылучаюцца дэлегаты на Ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп.

X. 25-30 студзеня 1933 г.

Для падвядзеньня вынікаў праведзенай работы па Ўсебеларускім двухмесячніку паходу склікаецца Ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп, працуючых у прадпрыемствах, якія вырабляюць тавары шырспажыву. На гэтым-жа зьлёце прысутнічаюць дэпутаты калгасаў і саўгасаў.

***

Увесь пэрыяд паходу, незалежна ад правядзеньня паасобных масавых мерапрыемстваў, прадпісваецца выключна для пасьпяховага завяршэньня шырспажыву IV кварталу і разгортваньня работы па забясьпечаньні выкананьня плянаў вырабу шырспажыву ў 1933 годзе.

Пасяджаньні Камісіі як цэнтральнай, так і раённых не абмяжоўваюцца тэрмінамі. Цэнтральная Камісія выклікае з дакладамі паасобныя РВК і саветы для праверкі ходу выкананьня мерапрыемстваў па паходзе.

На раённыя і гарадзкія камісіі ўскладаецца адказнасьць за арганізацыю шырокага асьвятленьня кожнага мерапрыемства па паходзе паасобку як у цэнтральным, так і мясцовым друку.

Незалежна ад пасланых матар'ялаў у друк, у Цэнтральную Камісію пры Прэзыдыуме ЦВК павінны быць прысланы дакладныя зводкі ходу работы па кожным этапе паасобку.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР.

Аб звальненьні за прагул бяз уважлівых прычын

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і СНК Саюзу ССР

З прычыны таго, што дзеючае працоўнае заканадаўства (п. «е» стар. 47 Кодэксу законаў аб працы РСФСР і адпаведныя пункты кодэксаў другіх саюзных рэспублік) дапускае звальненьне за прагул работніка бяз уважлівых прычын толькі ў тым выпадку, калі такі прагул меў месца на працягу ня дзён у агульнай складанасьці на працягу месяца, што ў сучасных умовах адсутнасьці беспрацоўя вахвочае парушэньні нармальны ход вытворчасьці і наносіць страту інтарэсам працоўных, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. Пункт «е» стар. 47 Кодэксу законаў аб працы РСФСР і адпаведныя пункты кодэксаў другіх саюзных рэспублік—лічыць атмененымі.

2. Устанавіць, што ў выпадку хоцьбы аднаго дню неяўкі на работу бяз уважлівых прычын, работнік падлягае звальненьню з прадпрыемства або з установы з пазбаўленьнем яго права карыстаньня выданых яму, як работніку данага прадпрыемства або ўстановы, харчовых і прамтаварных картак, а таксама з пазбаўленьнем права карыстаньня кватэрай, прадстаўленай яму ў дамох данага прадпрыемства або ўстановы

3. Прапанаваць урадам саюзных рэспублік унесьці адпаведныя зьмены ў кодэксы законаў аб правы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН)

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЕ

15 лістапада 1932 г., Масква, Крэмль.

20-га лістапада а 6-й гадзіне ўвечары ў клюбе К. Маркса

СКЛІКАЕЦЦА

V ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

Члены і кандыдаты ГК і ЦК, члены ЦКК і Гар. КК праходзяць па сваіх мандатах

Астатнія т. т.—па прапусках, якія будуць выдавацца сакратарам парткалектываў і ячэек у Гаркоме КП(б)Б у пакоі № 22 19 і 20-га лістапада ад 10-ці гадз. раніцы да 4-х г. д.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б Чарнушэвіч.

Бульба Ленінграду

Тэмпы адгрузкі нарастаюць нездавальняюча

Прырост за дзень толькі 1,7 процантаў. Неадкладна пакрыць запазычанасьць пралетарам Ленінграду

Чырвоны эшалён адпраўлены

БАБРУЙСК (па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Пералом у адгрузцы бульбы Ленінграду, які наступіў у зьвязку з прыездам т. *Гікало*, пачынае замацоўвацца. Калі 15 лістапада было адгружана 280 тон, дык 16 лістапада адгружана 400 тон. Бабруйшчына выканала свой абавязак—у гонар прыезду т. Гікало накіраваць пралетарам Ленінграду чырвоны эшалён з бульбай.

16 лістапада чырвоны эшалён колькасьцю 30 вагонаў адпраўлены.

Галавой задачай партыйнай арганізацыі і ўсёй савецкай грамадзкасьці Бабруйска зьяўляецца—*недапусьціць зьніжэньня тэмпаў* і ў бліжэйшыя дні завяршыць адгрузку застаўшыхся 1876 тон.

А. Дамброўскі.

У адзнаку прыезду тав. Жаброўскага

БАРЫСАЎ. 14 лістапада ў Барысаў для дапамогі ў ліквідацыі прарываў на бульбаадгрузцы прыбыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. *Жаброўскі.* 15 лістапада тав. *Жаброўскі* разам з старшынёй РВК тав. *Баранчыкам* выехалі ў *Браданскі* і *Баранскі* сельсаветы.

У адзнаку прыезду тав. Жаброўскага паміж сельсаветамі і калгасамі раёну разгарнулася сацспаборніцтва і ўдарніцтва на хутчэйшае выкананьне пляну адгрузкі бульбы пралетарам Ленінграду.

Полаччына дабілася перамогі

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало, ЦВК—тав. Чарвякову, СНК—тав. Бэнэку, рэдакцыям газэт „Зьвязда“ і „Савецкая Беларусь“.

Пад непасрэдным апэрацыйным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б Полацкі раён 16 лістапада плян адгрузкі бульбы Ленінграду выканаў на 100,5 проц.

РК КП(б)Б ПЫЖЫКАЎ, РВК ШАБАЛТАС

Па старонках раённых газэт

„Бабруйскі камуніст“

Становішча з выкананьнем плянаў па адгрузцы бульбы Ленінграду зьяўляецца зусім нездавальняючым. Дырэктывы ЦК КП(б)Б аб сканчэньні адгрузкі бульбы Ленінграду не позьней 10 лістапада ня выкананы. Асабліва пагражаючая апошняя пяцідзёнка—яўнае зьніжэньне тэмпаў адгрузкі.

***

Бюро Бабруйскага РК КП(б)Б папярэдзіла: «Старшынь Кавалеўскага, Цялускага, Пагрэцкага і Гарбацэвіцкага сельсаветаў і ўпаўнаважаных па гэтых сельсаветах, што ў выпадку не забясьпечаньня сталага пералому ў бок выкананьня плянаў адгрузкі ў бліжэйшыя дні, будзе пастаўчана пытаньне аб іх партыйнасьці».

***

«За дэзэртырства з фронту загатовак бульбы, ігнараваньне дырэктыў райкому Леонава з радоў партыі выключыць», такую пастанову вынесла РКК КП(б)Б упаўнаважанаму РК Леонаву за тое, што ён сыстэматычна пакідаў сельскі савет, выяжджаў у горад, ня гледзячы на тое, што Гарбачэўскі сельсавет знаходзіцца ў глыбокіх прарывах па бульбазагатоўках.

***

Бюро Бабруйскага РК ЛКСМ выключыла з радоў ЛКСМБ тав. Зубарэўскага Л за бязьдзейнасьць у справе загатовак бульбы.

«Старцаўская камсамольская ячэйка ня прымае актыўнага ўдзелу ў правядзеньні бульбазагатоўчай кампаніі. Калі брыгадзір РК зьвярнуўся да сакратара ячэйкі з прапановай склікаць камсамольскі сход, апошні адказаў: «Дзе-ж гэта іх цяпер зьбярэш, нельга гэтага зрабіць». На пленуме сельсавету, дзе абгаварвалася пытаньне загатовак, ня было ніводнага камсамольца».

***

«Гарбацэвіцкі сельсавет выканаў плян бульбазагатовак толькі на 7 проц. Упаўнаважаны па гэтым сельсавеце тав. Росьлік заяўляе цьвёрдаваданьнікам наступнае.

— Гэта ваша справа, хочаце здавай це, хочаце—не. Мая справа малая, я магу за вас зрабіць на пленуме добрую справаздачу,—так ён агітуе за выкананьне пляну бульбазагатовак».

***

Прыезд тав. Гікало ў Бабруйскі раён адзначаны чырвонымі абозамі з бульбай. Газэта «Бабруйскі камуніст» вакол прыезду сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало мабілізуе масы пад лёзунгам: «Адзначым прыезд у наш раён тав. Гікало магутнымі чырвонымі абозамі з бульбай, завяршэньнем адгрузкі бульбы пралетарам Ленінграду».

„Калгасная праўда“

Мінулыя дзесяць дзён лістапада далі прырост па бульбе толькі на 17 проц., У тым ліку па калгасным сэктары—6,9 проц. , па аднаасобным—28,1 проц. Па-ранейшаму зрываюць бульбазагатоўкі Ліпенькі, Сьвіслацкі і Ясенькі сельсаветы.

Дапусьціць далейшае зацягваньне загатовак нельга. Чарапашым тэмпам, апартуністычным самацёкам у ходзе кампаніі трэба пакласьці канец. Другая дэкада лістапада павінна быць апошнім тэрмінам загатовак».

***

Бюро Асіпавіцкага РК КП(б)Б абвясьціла пяцідзёнік штурму па адгрузцы бульбы Ленінграду. Заслаўскі раён, які цалкам выканаў і перавыканаў плян бульбазагатовак, узяў Асіпавіцкі раён на буксір. У Асіпавіцкі раён прыехала брыгада Заслаўскага раёну на чале з сакратаром райкому тав. Кудзольскім.

«Бальшавіцкі вопыт Заслаўшчыны трэба перадаць кожнаму сельсавету, вёсцы, камісіі садзейнасьці па Асіпавіцкім раёне».

У сувязі з прыездам буксірнай брыгады ў Асіпавіцкім раёне вынесена пастанова—да 18-га лістапада (апошні дзень пяцідзёнкі) дабіцца поўнага выкананьня адгрузкі бульбы Ленінграду.

„Ленінскі шлях“

Аднаасобнікі вёскі Антопаль здалі толькі 605 кгр. бульбы замест 4 тон. паводле пляну. Член сельсавету Гармакоў Мікіта не змагаецца за выкананьне пляну. Па вёсцы Малышкі яшчэ не здана 2605 кгр. Няма рашучага націску на кулацка-заможную частку вёскі. Цьвёрдазаданьнік вёскі Канстанцінаўка ня здаў ніводнага кгр. бульбы, а паводле пляну ён павінен здаць 2½ тоны.

***

За невыкананьне цьвёрдазаданьнікам Карпушэнка М. Е. Спаскага сельсавету цьвёрдага заданьня, які павінен здаць бульбы 150 пудоў, збожжавых 5 цнт. і катагарычнае адмаўленьне ад выкананьня, Нарсуд на падставе 94 арт. КК прыгаварыў яго да 3-х год пазбаўленьня волі ў агульных лягерах з канфіскацыяй маёмасьці. Гэта зьяўляецца прадасьцярогай для іншых цьвёрдазаданьнікаў, якія ня выконваюць заданьня перад дзяржавай. Нішчай літасьці кулаку. Зрыўшчыкаў загатовак на даву падсудных».

За ГРАНІЦАЙ

У фашыцкай Польшчы

Фабрыкі і заводы закрываюцца

ВАРШАВА. 16-XI. Згортванне прамысловых прадпрыемстваў у Польшчы набывае ўсеагульны характар. Усепольскае аб'яднанне заводаў, якія вырабляюць вадаправодныя і каналізацыйныя трубы заявіла аб маючым наступіць закрыцьці ўсіх прадпрыемстваў аб'яднаньня.

Закрыта некалькі тэкстыльных фабрык у Бельску (Верхняя Сілезія). У сувязі з вялізарнымі запасамі тавараў, якія накапіліся на складах, у самым хуткім часе мае наступіць закрыцьцё ўсіх суконных фабрык у Бельску.

Расстрэл беспрацоўных

ВАРШАВА, 15-XI. Каля гораду Петракава група беспрацоўных зрабіла спробу нападу на вугольны цягнік. Паліцэйскі канвой пачаў ружэйны агонь па беспрацоўных. Двое ўдзельнікаў нападу—**Раман Беласкурскі** і **Антон Лейман** забіты напавал. Абодвы забітыя—рабочыя закрытай гуты **«Кара»** ў Петрыкове.

Францускі друк аб савецка-румынскім пакце ненападу

ПАРЫЖ. 17-XI. Часопіс **«Люм'ер»** у артыкуле па пытаньні аб савецка-румынскім пакце ненападу піша, што Румынія «сваім існаваньнем абавязана Францыі». Між тым Румынія хістаецца, ня гледзячы на савецкую настойлівасьць, ня гледзячы на ўпарты націск КЭД-Орсэ заключыць пакт ненападу з СССР.

«Тытулеску хоча нас прымусіць думаць,—гаворыцца далей ў артыкуле,—што спрэчкі заключаюцца ў бесарабскім пытаньні. Але яму гэта ня ўдасца». Часопіс гаворыць, што «тут толькі адна праўдападобная фраза аб прычыне нязгоды Румыніі заключыць пакт. Румынія ня хоча браць новых саюзных абавязацельстваў у адносінах Францыі».

Паліцэйскія налёты на камуністычныя друкарні

БЭРЛІН. 17-XI. Паліцыя зрабіла налёты на памяшканьні рэдакцый і друкарняў камуністычных газэт **«Фур-Эхо»** у Эссэне, **«Прэйгайт»** у Дзюсельдорфе і **«Арбайтэр-Цэйтунг»** у Штутгарзе. Ва ўсіх гэтых рэдакцыях і друкарнях былі праведзены старанныя вобыскі, прычым у друкарні **«Фур-Эхо»** паліцыя канфіскавала некалькі машын.

«Ротэ-Фанэ» падкрэсьлівае, што гэтыя налёты зьяўляюцца падрыхтоўкай да новага наступленьня на камуністычны друк.

Даклад Літона—і СССР

НЬЮ-ЁРК. 16-XI. Жэнэўскі карэспандэнт **«Нью-Ёрк Таймс»** паведамляе, што ў Лізе нацый абмяркоўваецца пытаньне аб стварэньні новай арганізацыі—«Усеагульнай консультацыйнай камісіі» з мэтаю прыцягненьня ПАЗШ і Савецкага Саюзу для абмеркаваньня дакладу камісіі Літона. «Такім чынам,—указвае карэспандэнт,—можна будзе абыйсьціся бяз удзелу СССР у дыскусіях савету Лігі нацый. У выпадку, калі-б Сівецкаму Саюзу таксама, як і ПАЗШ было прапанавана на тэй падставе, што ён зьяўляецца ўдзельнікам парыскага дагавору, удзельнічаць у гэтай камісіі,—цяжка было-б абыйсьціся без аднолькавых адносін да абодвых краін».

«Нью-Ёрк Таймс» заяўляе, што Ліга нацый ужо паведаміла неафіцыйна ПАЗШ аб гэтым праекце і запрасіла думку ПАЗШ. Адказ, паводле слоў газэты, затрымліваецца ў сувязі з тым, што вырашэньне гэтага пытаньня прадстаўляецца Рузвэльту. У заключэньне газэта ўказвае: «Найгоршым з ускладненьняў зьяўляецца няпрызнаньне Савецкага Саюзу ПАЗШ».

Нота бэльгійскага ўраду аб даўгох

ВАШЫНГТОН. 16-XI. Паводле паведамленьня «Асошыэйтэд Прэс» бэльгійскі пасол у Вашынгтоне ўручыў дзяржаўнаму сакратару ПАЗШ Сымсону ноту бэльгійскага ўраду па пытаньні аб даўгох. Як паведамляюць, па сваім зьмесьце бэльгійская нота аналягічна з нотай англійскага і францускага ўрадаў.

„Маральныя" і эканамічныя довады Францыі

ПАРЫЖ. 14-XI. Друк удзяляе шмат увагі францускаму выступленьню ў Амэрыцы па пытаньні аб ваенных даўгох. Партыйнаяе у **«Эко дэ Пары»** фармулюе становішча наступным чынам:

«Даўжнікі Амэрыкі выступаюць пасабоку, але лёзанская джэнтэльмэнская згода адхіляе разыходжаньне ў іх словах і дзеяньнях».

Друк высоўвае ў якасьці доваду на карысьць перагляду даўгавых абавязацельстваў матывы «маральныя» і эканамічныя.

Да першых адносіцца: указаньне што на мінулагодняй канфэрэнцыі гу вэраўскі мораторы фактычна ўстанавіў сувязь паміж даўгамі і рэпарацыямі. Затым, з таго моманту, як эўрапэйскія даўжнікі Злучаных Штатаў самі перасталі атрымліваць штонебудзь ад Германіі, паўстала пытань не аб рэвізіі доўгавых абавязацельстваў у адносінах Амэрыкі.

Эканамічны довад заключаецца ў тым, што перагляд пытаньня аб даўгох дыктуецца агульнымі для ўсіх інтарэсамі, жаданьнем знайці выхад з сусьветнага эканамічнага крызісу».

«Калі правільна, што непаступленьне ўзносаў па даўгох нанясе ўдар па амэрыканскім дзяржаўным бюджэце,—піша «Эксэльсіор»,—дык таксама відавочна, што зьбядненьне краін даўжнікоў, у выніку заплаты даўгоў, прывядзе да далейшага зьніжэньня амэрыканскага зьнешняга гандлю і недабору падаткаў у ПАЗШ».

«Лібэртэ» заяўляе, што «калі Амэрыка будзе настойваць на плацяжох, Францыя павінна будзе ўнесьці суму плацяжу ў далярах у запасіт францускага банку і быць гатовай перадаць справу міжнародламу арбітражу».

РЫМ. 13-XI. Англійская нота Амэрыцы па пытаньні аб ваенных даўгох спаткана аднадушным адабрэньнем італьянскага друку. Газэты даюць зразумець, што за англійскай і францускай нотамі пасьледуе італьянская. Гэтыя намёкі падцьвярджаюцца ў блізкіх да ўраду колах.

Лёнданская паліцыя нездаволена

ЛЁНДАН. 17-XI. Міністр унутраных спраў Гільмур адказваючы на пытаньні ў палаце абшчын прызнаў наяўнасьць нездаволеньня ў радох лёнданскай паліцыі. Паводле слоў міністра рэгулярная паліцыя нездаволена існаваньнем паліцэйскіх атрадаў асобага прызначэньня — «спэцыяльных контэбляў». Міністр заявіў, што ім ужыты захады для таго, каб «зрабіць зусім зразумелым «што» далейшыя выпадкі недазволеных паводзін» выклічуць суровыя рэпрэсіі.

Сельска-гаспадарчы крызіс расьце

ВАРШАВА. 15-XI. Учора закончыўся скліканы ў Варшаве, так званы, **«Сельска-гаспадарчы зьезд»**. Гэты зьезд зьявіўся завяршэньнем арганізаванага ўрадам сельска-гаспадарчага «тыдню».

Дзякуючы вялізарнаму росту незадаволеньня ў вёсцы, польскі ўрад гэтым зьездам хацеў прадэманстраваць свае «клопаты аб інтарэсах сельскай гаспадаркі». Ня гледзячы на тое, што на гэты варшаўскі зьезд прыбылі дэлегаты па асобым падборы, зьезд зьявіўся наглядным дэманстрацыяй цяжкага стану сельскай гаспадаркі ў Польшчы і абвастрэньня супярэчнасьцяй паміж буйнымі аграрыямі і прамысловцамі.

Былы міністр земляробства заявіў на зьезьдзе, што ўрад бесьсільны даць сельскай гаспадарцы сур'ёзную дапамогу, бо **«тэмя дапамогі, якую ўрад ёй дае, не пасьпявае за разьвіцьцём крызісу»**.

Закон аб атаўскіх згодах

ЛЁНДАН. 17-XI. Паводле паведамленьня агенцтва **«Рэйтэр»** сёньня будзе апублікавана пастанова Міністэрства фінансаў, якая уводзіць у дзеяньне пункты законаў аб атаўскіх згодах з некаторымі выключэньнямі. Прэфэрэнцыі, якія прадугледжаны законам аб імпартных пошлінах, захоўваюць сваю сілу ў адносінах да ўсіх краін Брытанскай імпэрыі, з якімі заключана згода ў Атаве.

Новыя таможныя прэфэрэнцыі для краін Брытанскай імпэрыі,—за выключэньнем Індыі і Ньюфаўндленду, якія яшчэ не зацьвердзілі аўтаўскіх згодаў—набудуць моц 19 лістапада.

Трывога буржуазіі перад рыхтуемым галодным паходам

НЬЮ-ЁРК. 12-XI. У страху перад рыхтуемым галодным паходам у Вашынтон, гарадзкія ўлады Вашынтону разаслалі тэлеграмы губэрнатарам усіх штатаў і мэрам больш буйных гарадоў, у якіх патрабуюць, каб яны з дапамогай паліцыі перашкодзілі ўдзелу беспрацоўных сваіх штатаў і гарадоў у рыхтуемым паходзе.

Міжнародная хроніка

ВЕНА. 16-XI. Паводле паведамленьня з Бухарэсту, **абвастрэньне эканамічнага становішча ў Румыніі за апошні час прыняло катастрафічныя разьмеры.** Паводле даных міністэрства земляробства асеньняя сяўба скарочана на 30 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Кіруючая эканамічная газэта **«Аргут»** тлумачыць скарачэньне пасеўнай плошчы недахватам пасеўных насеньняў і наогул узмацненьнем крызісу ў сялянскіх гаспадарках.

БЭРЛІН, 17-XI. З Жэнэвы паведамляюць аб **рэвалюцыйных настроях сярод салдат.** 22 салдаты арыштаваны. Арыштавана таксама 20 рабочых камуністаў. «Жэнэўскія часьці вывезены з гораду і заменены больш «надзейнымі» для буржуазіі воінскімі часьцямі.

ЛЁНДАН. 17-XI. Лёрд **Ротэрмір** апублікаваў у **«Дэйлі Мэйль»** артыкул пад загалоўкам: «Эўропа павінна захаваць мір». Артыкул высоўвае зьнешняпалітычную камбінацыю, якая пад выглядам урэгуляваньня польска-германскіх границ імкнецца ізалёваць і абкружыць СССР. Праект Ротэрміра заключаецца ў тым, што Польшча зза рочвае данцыгскі калідор Германіі, у замену чаго «Германія, Францыя і Англія абавязваюцца абараняць усходнія границы Польшчы супроць нападу з боку Савецкай Расіі».

ПАРЫЖ. 17-XI. Пасьля правядзеньня мерапрыемстваў рацыяналізацыі, дырэкцыя вугольных шахтаў Асьцінскага горна-прамысловага раёну (Гішпанія) абвесьціла аб маючым наступіць звальненьні рабочых і пагражала нават закрыцьцём асобных шахтаў. **Прафсаюз,** у адказ на гэта, **абвесьціў усеагульную забастоўку.** У забастоўцы прынялі ўдзел усе гарнякі ў колькасьці 30.000 чалавек.

Тав. Гурэвічнам. Наркома РСІ

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР *пастанаўляе:*

Назначыць тав. *Гурэвіча Л. М.* намесьнікам Народнага Камісара Рабоча - Сялянскай Інспэкцыі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

В. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ЛЯУКОЎ.

Месячнік штурму пр рываў у загатоўках скурсыравіны

Заг тпунктам Саюзза атскур, Райзагам, Райкалгассаюзам, і ўсім сельспажтаварыствам калгасам і саўгасам

(Адкрыты ліст)

ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ.

Загатоўкі скурсыравіны за 10 месяцаў бягучага году прайшлі з вялікім прарывам. Пляны па буйных скурах выкананы ўсяго толькі на 72,4 проц., па дробных—на 82,6, сьвіных—на 50,4 і сабачых—на 27,8 проц.

Асабліва трэба адзначыць вялікі прарыў за апошнія два месяцы. Ён ставіць пад пагрозу зрыву работы скурабутковай прамысловасьці, якая зьяўляецца адной з асноўных галін прамысловасьці па выпуску тавараў шырспажыву. Выходзячы з гэтага, нарада Наркамлегпрому разам з прадстаўнікамі ЦП саюза скурнікаў, Саюзгатоскур, Белкаапсаюзу, скурнога і абутковага трэсту, Белкалгасцэнтру і прадстаўнікоў цэнтральнага друку пастанавіла абвясьціць месячнік штурму ліквідацыі прарыву ў загатоўках скурсыравіны з 10 лістапада па 10 сьнежня 1932 г.

Для пасьпяховага правядзеньня месячніка патрэбна цалкам укамплектаваць інстытут сельскіх зьбіральнікаў-зборшчыкаў. Калгасы і саўгасы павінны быць ахоплены дагаворамі на 100 проц. Паміж загатоўнікамі саюзу, райзагамі, сельспажтаварыствамі і пасобнымі работнікамі павінна разгарнуцца сапраўднае сацспаборніцтва і вышэйшая яго ступень—ударніцтва.

Усе гэтыя мерапрыемствы павінны быць вамі прапрацаваны сумесна з мясцовымі, партыйнымі і савецкімі арганізацыямі.

Таварышы калгасьнікі! Выдучайце са сваёго асяродку лепшых актывістаў-ударнікаў у якасьці зьбіральнікаў-зборшчыкаў скурсыравіны. Патрабуйце ад загатоўчых арганізацый заключэньня дагавораў і своечасовай прыём кі ад вас скурсыравіны, якая псуецца ў вас ад няўмелага хаваньня.

Трыкутнікі фабрык і заводаў скур абутковай прамысловасьці! Аказвайце дапамогу загатоўчым арганізацыям у правядзеньні вышэйпаказаных мерапрыемстваў. Выдучайце для правядзеньня месячніка штурму лепшых рабочых ударнікаў.

За выкананьне пляну загатовак скурсыравіны IV кварталу вызначаны спэцыяльны фонд для прэмірованьня лепшых работнікаў загатоўчых арганізацый, сельскіх зборшчыкаў-зьбіральнікаў і інш.

Бальшавіцкай настойлівасьцю, сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам забясьпечыце выкананьне і перавыкананьне гадавога пляну загатовак скурсыравіны.

Нам. Народнага Камісара Лёгкай Прамысловасьці БССР Кац.
Нам. Старшыні Праўленьня Белкаапсаюзу Верба.
ЦП Саюзу Скурнікаў БССР Белкалгасцэнтр Кін.

ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ

Зламаць кулацкі сабатаж

Цалкам спагнаць цьвёрдыя заданьні ў найкарацейшы тэрмін

Прырост за пяцідзёнку на 1,8 проц.

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.). За апошнія часы тэмпы збожжазагатовак па раёне значна аслаблі. За апошнюю пяцідзёнку прырост складае толькі 1,8 проц.

Асноўная прычына марудных тэмпаў збожжазагатовак—адсутнасьць масавай работы і патураньне кулаку. Толькі па адным *Смалявіцкім* сельсавеце цалкам спагнаны цьвёрдыя заданьні. А ёсьць сельсаветы (Клыніцкі, Ліскі, Юраўскі і Пятровіцкі), дзе цьвёрдыя заданьні спагнаны ад 11 да 13 проц.

Недапушчальна марудна праходзіць спагнаньне насеннай пазыкі (плян выкананы на 12,4 проц.). Калгасы *«ПЕРАМОГА»*, *«1 Майск»*, *«Будзённы»*, *«Чырвоны Кастрычнік»* (Пятровіцкі сельсавет), *«Ураджай»*, *«Сталінец»*, *«Праца»* (Юраўскі сельсавет) і ўсе калгасы *Драчкаўскага* сельсавету не зьвярнулі ніводнага кілё насеннапазыкі.

Таксама марудна праходзіць спагнаньне памольнага збору (25,4 проц.). *Жодзінскі* сельсавет выканаў плян на 6,4 проц., *Плісскі*—14,2 проц. і г. д. Некаторыя млыны разбазарваюць памольны збор (Амельянаўскі, Збалоцкі і інш.).

Раён мае ўсе магчымасьці для выкананьня пляну збожжазагатовак у вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін. Патрэбна толькі рашуча ліквідаваць паданьня вышэй недахопы. Трэба мацней націснуць на кулака, зламаць кулацкі сабатаж і ў найкарацейшы тэрмін дамагчыся поўнага завяршэньня збожжазагатовак.

П. К.

Такія камісіі садзейнасьці толькі шкодзяць

РАГАЧЭЎ. Раён мае значны прарыў на фронце збожжазагатовак. Асноўная прычына адставаньня—недацэнка аднаасобнага сэктару. Масава-растлумачальная работа сярод беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў не разгорнута. Рад сельсаветаў патурающь кулаку і ня прымаюць рашучых мер да спагнаньня цьвёрдых заданьняў.

Камісіі садзейнасьці нічога ня робяць. Так, па **Азаранскім** сельсавеце самі члены камісіі садзейнасьці ня выконваюць сваіх абавязацельстваў па здачы (продажы) збожжа дзяржаве.

Лаўнейшы самацёк у выкананьні збожжазагатовак панує і ў **Мяркулавіцкім** сельсавеце. Члены камісіі садзейнасьці вёскі Відрыца **Я. Жураўлёў** і **П. Дзяргачоў** не разгарнулі ніякай масавай работы і самі не здаюць збожжа. Ніводная кулацка-заможная гаспадарка в. Будзілава ня выканала цьвёрдага заданьня па збожжы.

(БЕЛТА).

Вобыльскі сельсавет перавыканаў плян за гатовак

СІРОЦІНА. Дзякуючы добра пастаўленай масава-арганізацыйнай рабоце *Вобыльскі* сельсавет выйшаў на першае месца ў раёне па загатоўках збожжа. На 1 лістапада сельсавет перавыканаў плян. Па цьвёрдых заданьнях збожжазагатоўкі амаль цалкам выкананы. Барацьба за збожжа працягваецца.

Б.

Абмежавалі я пастаноўкамі п'ес...

ВОРША. Ня гледзячы на ўрачыстыя абяцаньні з боку раённых арганізацый да дню XV гадавіны Кастрычніка завяршыць збожжазагатоўкі—плян загатовак і на сёньнішні дзень далёка ня выкананы.

Райзагатзбожжа, райснаб і большасьць сельсаветаў ня здолелі арганізаваць актыўнасьць мас на завяршэньне загатовак у тэрмін. Правядзеньне сьвяткаваньня XV гадавіны Кастрычніка з боку некаторых раённых арганізацый ня было ўвязана з пытаньнем ударнага правядзеньня збожжазагатовак. Калектывы рабочых і служачых высланыя ў часе сьвята ў падшэфныя сельсаветы і калгасы, абмежаваліся толькі пастаноўкамі п'ес і дакладамі, зусім выпусьціўшы з пад увагі правядзеньне масавай работы на ўдарнае завяршэньне збожжазагатовак.

Большасьць сельсаветаў працягваюць цацкацца з кулаком. Цьвёрдыя заданьні з заможных гаспадарак спагняюцца вельмі марудна. Толькі 4 сельсаветы—Яронкаўскі, Копыльскі, Сталінскі і Панізоўскі набліжаюцца да завяршэньня збожжазагатовак.

(БЕЛТА).

Справа гонару кожнага раёну

быць у першых радох у барацьбе за фінплян IV кварталу

Пераняць вопыт перадавых

Бабруйск. (Наш. кар.). Бабруйшчына адстае ў выкананьні фінансавага пляну. Квартальны плян па 10-XI выкананы ўсяго толькі на 37,9 проц. Такім чынам, раён уэятае абавязацельства—да XV гадавіны Кастрычніка даць 60 процантаў квартальнага фінпляну—ня выканаў.

Але побач з агульным адставаньнем раёну, асобныя арганізацыі, сельсаветы і калгасы раёну паказалі сапраўды ўдарныя тэмпы ў барацьбе за выкананьне фінансавага пляну. Райкалгассаюз на 10-га лістапада падыходзіць да завяршэньня квартальнага фінпляну, гарсавет дамогся выкананьня фінпляну на 75 проц.

Сярод сельскіх саветаў на першым месцы стаіць **Варатынскі** і **Петрыкаўскі** сельсаветы, якія па страхоўцы, падатку і самаабкладаньні амаль завяршаюць выкананьне квартальнага пляну. Гэтых посьпехаў яны дамаглісь дзякуючы шырокага разгорнутай масавай рабоце. Выкананьне фінпляну цесна зьвязана з выкананьнем усіх іншых гаспадарча-палітычных кампаній. Пытаньне аб выкананьні фінпляну шырока абгаворана на агульных сходах працоўнага сялянства, на зьлётах калгасьнікаў сумесна з працоўнымі аднаасобнікамі. Сельсаветы разьбіты на асобныя вучасткі, да якіх прымацаваны актыў сельсавету. Апошні цалкам адказвае за становішча ўсёй работы на сваім вучастку, работу якога правярае прэзыдыум сельсавету.

Значныя дасягненьні ў выкананьні фінпляну мае і **Харлапавіцкі** сельсавет; па страхоўцы плян выкананы на 100 проц., па падатку—на 90 проц. і г. д.

Вопыт работы па барацьбе за фінплян гэтых сельсаветаў павінен быць пераняты ўсімі арганізацыямі і сельсаветамі Бабруйшчыны.

А. Дамброўскі.

Выканаць фінплян IV кварталу—наш гонар

У IV квартале гэтага году мы павінны пакласьці апошні моцны камень у фундамант завяршэньня першай пяцігодкі і пачаць практычнае ажыцьцяўленьне грандыёзнага пляну другой бальшавіцкай пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Посьпехі выкананьня народна-гаспадарчага пляну ў значнай меры залежаць ад выкананьня фінпляну.

Паўлаўскі сельсавет, Сураскага раёну, з гонарам выконваў і перавыконвае з кварталу ў кварталу плян мабілізацыі сродкаў, як-та: плян II кварталу выкананы на 145,8 проц., III кварталу—на 130 проц. і да XV-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі плян IV кварталу выкананы на 54,1 проц.

Ва ўсёй рабоце Паўлаўскі сельсавет ужываў і ўжывае сацыялістычныя метады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі і асобнымі фінансавымі актывістамі.

Урачысты пленум Паўлаўскага сельсавету бярэ на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Датэрмінова выканаць плян мабілізацыі сродкаў IV кварталу, забясьпечыць на ўсе 100 проц. рэалізацыю пазыкі «4-га заключнага» да 1-XII 32 г.

2. Забясьпечыць 100-процантнае выкананьне усіх відаў загатовак, у тым ліку і апрацоўку і здачу (продаж) ільнавалакна да 25 лістапада.

3. Шляхам шырокай папулярызацыі ўсіх пастаноў партыі і ўраду, разгорнутым сацспаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечыць выкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў.

Выклікаем на сацспаборніцтва Чабруўскі сельсавет. Сураскага раёну. Заклікаем усе сельсаветы БССР пасьледаваць нашаму прыкладу.

Па дэручэньні ўрачыстага пленуму сельсавету, прысьвечанаму XV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Пралашкевіч.
Гаўрыленка.
Хвёдараў.

У IV квартале дабіцца перамогі

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Барысаўскі раён узяў на сябе адказнейшую задачу—да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаць фінплян на 50 пр. Аднак гэтай задачы Барысаўшчына ня выканала. На 11 лістапада фінплян па раёне выкананы ўсяго на 46,5 проц.

Прычыны адставаньня хаваюцца ў недацэнцы некаторых арганізацый гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы, у адсутнасьці масава-растлумачальнай работы, апэрацыйнага кіраўніцтва ходам выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў. Вось факты: Райспажыўсаюз на 6 лістапада выканаў плян мабілізацыі сродкаў на 24,4 проц., а на 11 прырост складае толькі 0,8 пр. Райшчалкаса на 6 лістапада плян мабілізацыі сродкаў выканала на 21,9 проц., а прырост за пяцідзёнку—3.2 пр. Банк за апошнюю пяцідзёнку зусім прыросту ня даў, яго не дала РКС і Райза.

Паасобныя ЗРК таксама чарапашынымі тэмпамі вядуць барацьбу за фінплян. Так, ЗРК Бярэзінскага камбінату плян мабілізацыі сродкаў выканаў на 28,3 проц., ЗРК «Камінтэрн»—на 23,4 проц. Толькі некаторыя арганізацыі, паклаўшы ў аснову масава-палітычную работу, дамаглісь перамогі на фінансавым фронце.

Падзённая каапэрацыя гадавы плян мабілізацыі сродкаў на 11 лістапада выканала на 127,1 проц., МТС на 100.1 проц. Гэтыя арганізацыі паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы барацьбы за фінплян 4-та заключнага году пяцігодкі.

Адной з асноўных прычын невыкананьня Барысаўшчынай фінпляну зьяўляецца апартуністычная недацэнка рэалізацыі і афармленьня пазыкі «4-та завяршаючага». Па ўсім раёне рэалізавана пазыкі на 1.447.520 руб. замест пляну 2.010.000; афармлена-ж на 10 лістапада ўсяго 1.264.420 руб.

Асабліва адстаюць у рэалізацыі пазыкі сельсаветы і калгасы. Доказам гэтага могуць служыць наступныя лічбы: па калгасах афармлена пазыка на 26 проц., па аднаасобным сэктары—толькі на 9,07 проц.

Партыйныя, камсамольскія ячэйкі, сельсаветы і камсоды не надаюць асаблівай увагі пытаньню барацьбы за фінплян.

З першага лістапада абвешчан усесаюзны конкурс друку на лепшую барацьбу за выкананьне фінансавага пляну IV кварталу і ўсяго 1932 году, а таксама і на забясьпечаньне пасьпяховай работы па фінпляне ў 1933 годзе. З часу абвяшчэньня конкурсу ўключылася зусім нязначная колькасьць мясцовых газэт. У большасьці газэт ня знойдзеш на старонках матэрыялу аб барацьбе за фінплян.

Мы ў IV квартале павінны мабілізаваць 1.828.185 руб. Гэта баявая задача нашага раёну, гэта задача кожнай арганізацыі, прадпрыемства, ўстановы, сельсавету, калгасу; гэта баявая задача фабрычна-заводзкага, сельсавецкага і калгаснага друку, задача кожнага рабселькора, кожнага працоўнага, і за гэту задачу мы павінны па-бальшавіцку змагацца, каб дабіцца перамогі.

IV квартал павінен стаць кварталам бальшавіцкай барацьбы за фінплян. Справа гонару ўсіх арганізацый нашага раёну і працоўнага насельніцтва дамагчыся зьнішчэньня Барысаўскага раёну з чорнай дошкі.

Яцкевіч.

У калёне перадавых па выкананьні фінпляну IV кварталу

(Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва па становішчы на 10-XI)

	Добраахвотныя плацежы.	Агульны плян.
Заслаўскі	87,1	86,3
Лельчыцкі	71,4	62,1
Лепельскі	69,7	62,2
Старобінскі	68,2	62,6
Жыткавіцкі	57.2	64,8
Жлобінскі	55.6	48,3
Мсьціслаўскі	49,2	73,3
Лагойскі	47,4	56,8
Плешчаніцкі	44.2	64,2
Ізяславскі	42,6	74,4
Клімавіцкі	42,3	54,7
Сіроцінскі	41,9	54,8

Раёны, якія цягнуцца ў хвасьце

Талачынскі	19,4	47,4
Бялынічскі	19,2	29,2
Чавускі	19,1	39,5
Полацкі	18,2	45,3
Веткаўскі	17,9	37,1
Чачэрскі	17.8	34,6
Дуброўенскі	17,4	36,1
Чэрвенскі	17,2	47
Касьцюковіцкі	17 2	34,9
Чашніцкі	17,2	46,6
Магачэўскі	16,7	43,2
Парыцкі	16,6	37,7
Асіпавіцкі	15,9	38,5
Бярэзінскі	15,9	40,8
Церахаўскі	13,9	31,3
Брагінскі	12,4	37,3
Нараўлянскі	8,8	31,4
Лоеўскі	8,4	32,1
Страдарскі	5,4	27
Кармянскі	4,8	37,2

Менгарком КП(б)Б паведамляе аб сьмерці старога члена КП(б)Б тав.
МЭЕРХОЛЬД Рахіль Натанаўны
надмышоўшай 17-XI-г. г.
Вынас цела адбудзецца 18-XI а 1-ай гадзіне дня з Нэрвовай клінікі—Валадарская, 16.
МЕНГАРКОМ КП(б)Б

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Каса з 1 г. дня
Ад 14 лістапада Мастацкі фільм
Снайпэр
(Нямы варыянт)
У гал. ролях: Афіцэр Б. Шліхінг, саздат П. Собалеўскі. Рэж. Цімашэнка. Звыш праг. кіно-хроніка Саюзкіно

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.
Дуглас Фэрбэнкс
Сын Зора
(Новы экзэмпляр)

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менскага гарадзкога савету ад 6 лістапада 1932 г.

У адзнаку XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі і ў гонар лепшых барацьбітоў за Кастрычнік у БССР, Прэзыдыум Менскага гарадзкога савету

ПАСТАНАЎЛЯЕ

Задаволіць хадайніцтва рабочых гор. Менску аб перайменаваньні:

1. Менскага вагона-рамонтнага заводу „Полымя рэвалюцыі" у завод імя Мясьнікова.
2. Менскую галянтарэйную ф-ку „Беларуска" у ф-ку імя Фрунзэ.
3. Надаць МШУ МБВ чыгункі імя Кнорына.
4. Надаць Менскаму будаўнічаму тэхнікуму імя Фрунзэ.
5. Надаць Менскаму індустрыяльна-пэдагагічнаму тэхнікуму імя Шаранговіча.

Прэзыдыум Менскага гарадзкога савету заклікае рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў перайменаваных прадпрыемстваў, навуковых і пэдагагічных работнікаў, студэнтаў і вучняў будаўнічага і індустрыяльна-пэдагагічнага тэхнікумаў і МШУ МБВ чыг. змагацца за прамфінплян, за якасьць прадукцыі, за паляпшэньне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых, за якасьць вучобы, за марксыцка-ленінскае выхаваньне так, як змагаліся гэтыя таварышы за Вялікі Кастрычнік, імя якіх кадзена Вашым прадпрыемствам і навучальным установам.

Няхай жыве XV гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі і яе правадыр і арганізатар—камуністычная партыя на чале з тав. Сталіным.

Старшыня Менгарсавету ВАЛОДЗЬКА
Сакратар Гарсавету ЛЮЦЬКО

КУЛЬТАВАРЫ—У МАСЫ!

Мы высылаем пасылкамі па пошце і чыгункай у любы пункт Саюзу—калектывам і паасобным заказчыкам.

МУЗЫКАЛЬНЫЯ ІНСТРУМАНТЫ.

Балалайкі цаною: 20 руб., 25 руб., 30 руб., 40 руб., 50 руб., 65 руб. і даражэй. Мандаліны цаною: 70 руб., 80 руб., 90 руб., 120 руб. і даражэй. Гітары цаною: 70 руб., 80 руб., 95 руб., 105 руб. 130 руб. і даражэй.

АРКЕСТРЫ

Струнныя: неапалітанскія, вялікарускія, домравыя—складамі ад 12-ці інструмантаў цана 500 руб. і даражэй.

Духавыя аркестры—складамі ад 12-ці інструмантаў. Цана 4500 руб. і даражэй.

При заказе на духавыя аркестры ўвесь кошт перавесьці на наш кант-кар. рахунак у Маскоўскую Абласную Кантору Дзяржбанку № 6757.

Ёсьць таксама: піянэрск. трубы (18 руб. 50 кап. і 20 руб. 50 кап.), Кавалерыйск. трубы (39 руб. 75 кап. і 43 руб. 75 кап.), фанфары—55 руб. і 61 руб., піянэрск. барабаны (43 руб. і 61 руб.).

У вялікім выбары: струны, самавучыцелі, пласьцінкі грамафонныя (ад 2 руб.), мэбран. грамафон. (15 руб. 75 кап.), іголкі грамафон. 5 руб. 35 кап. за 1000 шт.

ФОТОПРЫЛАДЫ.

Фота-апараты, скрынкав. з наводкай на фокус Цана 41 руб. 65 кап.

Статывы (драўляныя і жалезныя) 10 руб. 20 кап., 11 руб. 90 кап. і 12 руб. 60 кап.

Кюветы (ванны) ад 75 кап. да 3 руб. 10 кап., ліхтары „Улітка"—6 руб. 37 кап.

Рамкі капіров. ад 1 руб. 25 кап. да 1 руб. 65 кап., фота-пласьцінкі, блянкі, паспарту, альбомы, хімікалі, фота-папера і адкрыткі высылаюцца ў залежнасьці ад наяўнасьці на складзе.

КАНЦЭЛЯРСКІЯ ТАВАРЫ.

Шклографы. Цана апарату 175 руб. Запас рэактываў на 3 месяцы—100 руб.

Шклограф-матаграф. Цана апарату 220 руб., запас рэактываў 130 руб.

При заказе на шклографы абавязковы задатак 150 руб. на кожны апарат і дазвол міліцыі на права купілі.

Ёсьць таксама розныя канцэлярскія тавары.

Каб ухіліцца лішняй перапісцы запомніце нашы ўмовы:

Паасобным спажыўцам заказы высылаюцца выключна пасьля атрыманьня поўнага кошту выпісанага тавару.

Арганізацыі павінны прысылаць адначасова з заказам задатак ня менш 50 проц. агульнай сумы заказу.

Задатак і заказы шлеце па адрасе: Масква, Маскварэцкая № 26/0.

Дырэктарыят пасылачнага гандлю „ГОРТ"

Увага: Электрычных ліхтароў і алмазаў няма.

ТЭХНІК АДЗІНОКІ шукае пакой і кут
Паведаміць: Ленінская, 30, кв. 5, Мунвэз

ЗГУБЛЕНА
вэ за на праезд на станцыю Радашковічы выданая Рагачэўскім сельсаветам
Кажур М П.

ЗГУБЛЕНЫ
атэстат аб сканчэньні Цімірязеўскай акадэміі на імя
АГАЕВА Ляваніка Міхайлавіча.
Лічыць несапраўдным.

Згублены гадавы праязны білет № 564222, выд. 4-II-32 на імя Швабоўскі В. Н. лічыць страціўшым моц.

ЗГУБЛЕНА
дамавая кніга на імя
АСТРОЎСКАГА А.,
Ракаўскі завулак, дом 11, кв. 2
Прашу зьвярнуць па паказаным адрасе

УКРАДЗЕНЫ:
гадавы праязны білет за № 134475, пропуск на права праходу па шляхох і мастох за № 32961, членская прафсаюзная кніжка за № 48550, выпіска з рэзку „В" за № 12700. Перадачаныя дакумэнты, выданыя на імя тэхніка жывой абароны дыстанцыі шляху МБВ чыг. **КЕНДЫША ЦІМОХА ФЁДАРАВА**
Лічыць несапраўднымі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Упав. Галоўлітбелу А—54.

Друкарня імя Сталіна.